лі. Не выконвалі распараджэнняў нямецкіх улад, хаваліся ў мясцовых лясах, дапамагалі партызанам.

Правалілася спроба фашыстаў арганізаваць з мясцовых жыхароў паліцыю. Амаль усе 13 аднасяльчан, што паступілі на службу да акупантаў восенню 1941 года, праз месяц-другі агледзеліся: некаторыя з іх наладзілі сувязь з камуністычным падполлем, другія проста зразумелі, што хаўрусы з «новымі ўладамі» да дабра не прывядуць. У першую ж ваенную зіму большая частка паліцэйскіх была расстраляна самімі акупантамі.

З вайны не вярнулася 155 чалавек — загінулі на франтах і ў партызанскіх атрадах, прапалі без вестак; расстраляна, павешана і спалена жывымі больш як 80 мірных жыхароў. Але і гэтыя лічбы яшчэ не канчатковыя: прайшлі гады, памяць людзей і архівы ўсіх не зберaглі... У 1943 годзе вёска другі раз у гэтым стагоддзі была цалкам знішчана.

...Да 1950 года на папялішчах вайны вырaслі новыя дамы і вытворчыя памяшканні калгаса. Жыццё ў вёсцы аднавілася...

...1989 год. Вёска стала цэнтрам новага саўгаса «Чырвоны Сцяг» — назва ў памяць аб гістарычных падзеях у гады грамадзянскай вайны, мужнасці яе жыхароў пры абароне Радзімы. Пачалося трэцяе ў стагоддзі адраджэнне населенага пункта. Будуецца жыллё, грамадскія і вытворчыя пабудовы. У вёсцы працуюць сярэдняя школа, участковая бальніца, сельскі Дом культуры з бібліятэкай, тры магазіны, аддзяленне сувязі, лясніцтва...

Вёска Мялешкавічы — якая ўзнікла ў сярэдзіне ці канцы XV стагоддзя — частка гісторыі нашага Палесся. Працавітыя людзі паклалі пачатак гэтай вёсцы, не адзін раз яе адраджалі, за яе жыццё гінулі. І жыццё працягваецца...

*М. Галенка, М. Капач*

## Помнікі гісторыі

### ГОРАД МАЗЫР

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** аб рэвалюцыйных падзеях і расстрэле дэманстрацыі рабочых у Мазыры ў 1905 г. (вул. Ленінская, 5).

**ПОМНІК НА БРАЦКІХ МОГІЛКАХ** змагароў за Савецкую ўладу, якія загінулі ў 1918 — 1920 гг. (вул. Фрунзе, каля стадыёна).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** на доме № 32, дзе 5.3.1920 г. у баі з белапалякамі загінуў камісар брыгады 41-й дывізіі, дзяржаўны і ваенны дзеяч Украіны М. С. Данілеўскі (вул. Ленінская).

**МЕМАРЫЯЛЬНЫ ЗНАК** на месцы дома, у якім у 1917—1920 гг. праходзілі з'езды рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў Мазырскага павета (вул. Ленінская).

**АБЕЛІСК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** падпольшчыкаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вул. Крупскай, на тэрыторыі сярэдняй школы № 4).

**КУРГАН СЛАВЫ, БРАЦКІЯ МОГІЛКІ** савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў 1943—1944 гг. (вул. Рыжкова).

**ПОМНІК ХАРУЖАЙ ВЕРЫ ЗАХАРАЎНЕ** — зямлячцы, дзеячу рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, арганізатару і кіраўніку камуністычнага падполля ў Віцебску ў Вялікую Айчынную вайну, публіцысту, Герою Савецкага Саюза (вул. Ленінская).

**ПОМНІК У ГОНАР САВЕЦКІХ ЛЁТЧЫКАЎ,** якія ўдзельнічалі ў Мазырска-Калінкавіцкай аперацыі (вул. Інтэрнацыянальная).

**ПОМНІК 100 РАБОТНІКАМ** дрэваапрацоўчага камбіната, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вул. 8 Сакавіка).

**ПОМНІК 7 РАБОЧЫМ** металаапрацоўчай арцелі «Молат», якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вул. Ленінская).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** на доме, дзе быў палявы шпіталь, у якім лячыліся ў 1944— 1945 гг. параненыя воіны (вул. Фрунзе, 1).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** на доме, дзе быў прызыўны пункт ваеннага камісарыята ў 1941 г. (вул. Пралетарская, 98).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** ў гонар воінаў 111-га палка 55-й стралковай дывізіі 61-й арміі Беларускага фронту, якія ў студзені 1944 г. удзельнічалі ў вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (вул. Гогаля, 100).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** ў гонар воінаў лыжнага батальёна і вучэбнага атрада 55-й стралковай дывізіі Беларускага фронту, якія ў студзені 1944 г. удзельнічалі ў вызваленні




горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (вул. Інтэрнацыянальная, 63).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** ў гонар Талкачова Яўгена Іосіфавіча – падпольшчыка, які вучыўся ў сярэдняй школе № 2, загінуў у гады вайны (вул. Ленінская, 1).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** ў гонар землякоў – работнікаў Мазырскага тэхнічнага Верхнедняпроўскага басейнавага ўпраўлення рачнога параходства, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вул. Савецкая, 105).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** ў гонар воінаў 14-й і 15-й гвардзейскіх дывізій Беларускага фронту, якія ў студзені 1944 г. удзельнічалі ў вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (вул. 8 Сакавіка).

**ПОМНІК У. І. ЛЕНІНУ** на цэнтральнай плошчы горада.




## АСАВЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

### Вёска АСАВЕЦ

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні раёна (цэнтр вёскі).

**ПОМНІК НА МАГІЛЕ** воіна-інтэрнацыяналіста А. М. Дубеня, які загінуў 19.3.1984 г. у Афганістане (мясцовыя могілкі).

### Вёска КРЫНІЧНАЯ ГРАДА

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні раёна (паўднёва-заходняя ўскраіна вёскі).

### Вёска КАМЕНЬ

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў баях ці памерлі ад ран у шпіталі ў 1941—1944 гг. (усходняя ўскраіна вёскі).

**ПОМНІК НА МАГІЛЕ** ахвяр фашызму — мірнага насельніцтва, якія былі закатаваны ў 1941—1943 гг. (усходняя ўскраіна вёскі).

### Вёска КРУШНІКІ

**ПОМНІК ЮНІЦКІМ,** якія загінулі ў гады неабгрунтаваных палітычных рэпрэсій у 1937—1939 гг. Устаноўлены на магіле А. Б. Юніцкай, у якой расстраляны муж, 5 сыноў і нявестка (вясковыя могілкі).

### Былая вёска СПРЫМАЧОЎ

**ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ** — жыхарам гэтай і навакольных вёсак, якія закатаваны ў 1943 г. (на паляне па дарозе Крушнікі — Раманаўка).

## БАРБАРОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### Вёска БАРБАРОЎ

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі), у тым ліку грамадзянін Славакіі Я. Генжэль.

## КАМЕНКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### Вёска БЯРОЗАЎКА

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў баях ці памерлі ад ран у шпіталі ў 1943—1944 гг. (усходняя ўскраіна).

### Вёска ВЯЛІКІ БОКАЎ

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вясковыя могілкі).

**ПОМНІК НА МАГІЛЕ** воіна-інтэрнацыяналіста, работніка органаў міліцыі Царэнкі А. П., які загінуў пры выкананні службовых абавязкаў 31.5.1983 г. (вясковыя могілкі).

### Вёска КАМЕНКА

**ПОМНІК, МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ КУРГАН І ПАРК,** створаныя ў памяць аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі).

### Вёска МЯЛЕШКАВІЧЫ

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (на вясковых могілках).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** ў гонар узнагароджання вёскі ў 1928 г. ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР — за мужнасць і гераізм яе насельніцтва ў гады грамадзянскай вайны (на будынку школы).

## КОЗЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### Вёска БАБРАНЯТЫ

**ПОМНІК М. І. КАЛІНІНУ** каля будынка праўлення калгаса імя М. І. Калініна.

### Вёска КОЗЕНКІ

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў баі ці памерлі ад ран у шпіталі ў 1944 г. (вясковыя могілкі).

**ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ,** якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** на будынку Дома культуры ў памяць аб падпольнай патрыятычнай групе А. Б. Няпомняшчага, якая дзейнічала ў вёсцы ў 1942 г.

## КРЫНІЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### Вёска БІБІКІ

**ПОМНІК НА МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні раёна (на вясковых могілках).

**ПОМНІК НА МАГІЛЕ** аднавяскоўца маёра Тарасава Мікалая Апанасавіча, які загінуў 24.6.1944 г. пры вызваленні Палесся (на вясковых могілках).

### Вёска ТВАРЫЧАЎКА

**ПОМНІК Ф. Э. ДЗЯРЖЫНСКАМУ.** У цэнтры вёскі, каля праўлення калгаса імя Ф. Э. Дзяржынскага.

## МАХНАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

### Вёска ЗАБАЛАЦЦЕ

**ПОМНІК НА МАГІЛЕ** ахвяр фашызму — мірных жыхароў вёскі, якія закатаваны ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі).

### Вёска МАХНАВІЧЫ

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вясковыя могілкі).

**ПОМНІК НА МАГІЛЕ** ахвяр фашызму — мірных жыхароў вёскі, якія расстраляны ў Вялікую Айчынную вайну (у лесе за 0,5 км на ўсход ад вёскі).

**ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ,** якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі).

## МІХАЛКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### Вёска МАЛЫ БОКАЎ

**ПОМНІК НА МАГІЛЕ** ст. лейтэнанта А. М. Мельнічэнкі, лётчыка Савецкай Арміі, які загінуў 25.10.1983 г. у Афганістане (вясковыя могілкі). У вёсцы адна з вуліц носіць яго імя. На будынку школы, дзе ён вучыўся, устаноўлена **МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА.**

### Былая вёска МІХАЛКІ

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вясковыя могілкі).

**ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ,** якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вясковыя могілкі).

### Былая вёска КУСТАЎНІЦА

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вясковыя могілкі).

### Вёска ПРАЎЦЮКІ

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** (на будынку сельскага магазіна) у памяць аб камандзіры брыгады Чырвонай Арміі В. Д. Каўшове, які загінуў у вёсцы 11.11.1920 г. у баі з бандамі Булак-Балаховіча. Пахаваны ў Маскве на Краснай плошчы.

### Вёска РУДНЯ МІХАЛКАЎСКАЯ

**ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ,** якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі).

### Дарога РУДНЯ МІХАЛКАЎСКАЯ — МІХАЛКІ

**КРЫЖ З МЕМАРЫЯЛЬНАЙ ДОШКАЙ** аб тым, што ў гэтым лесе ў 1937—1939 гг. было расстраляна і пахавана каля 700 чалавек — ахвяр неабгрунтаваных палітычных рэпрэсій.

## ПРУДКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### Вёска ЗАГОРЫНЫ

**ПОМНІК НА МАГІЛЕ** юнгі Дняпроўскай ваеннай флатыліі Краўчанкі Эміля Андрэевіча, які загінуў 23.6.1944 г. (вясковыя могілкі).

### Вёска ПРУДОК

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў студзені 1944 г. пры вызваленні раёна (вясковыя могілкі).

## СКРЫГАЛАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### Вёска БЕЛАЯ

**ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ,** якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (у цэнтры вёскі).

### Вёска ЖАХАВІЧЫ

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні раёна (вясковыя могілкі).

### Вёска ЛЕШНЯ

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** на будынку Ляшнянскай школы ў памяць аб земляку, былым вучні школы, Герої Савецкага Саюза М. П. Катлаўцу, які загінуў у 1944 г.

### Вёска РУДНЯ СКРЫГАЛАЎСКАЯ

**ПОМНІК НА МАГІЛЕ** воіна Чырвонай Арміі А. Багданава, які загінуў у 1944 г. пры вызваленні раёна (вясковыя могілкі).

### Вёска СКРЫГАЛАЎ

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вясковыя могілкі).

**ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ,** якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (цэнтр вёскі).

**ПОМНІК** на месцы мяркуемага пакарання смерцю ў 1497 г. крымскімі татарамі мітрапаліта Кіеўскага і Усея Русі Макарыя (на беразе старога рэчышча Прыпяці за 1 км ад вёскі). У цэнтры вёскі ў канцы XIX ст. пабудавана капліца з іконай святапакутніку Макарыю.

## СЛАБАДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### Вёска БУДА КАЗІМІРАЎСКАЯ

**ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ** – мірным жыхарам вёскі, якія закатаваны 22.3.1943 г. (на заходняй ускраіне).



Помнік жыхарам в. Казіміраўка

**АБЕЛІСК** ва ўрочышчы Белакор'е на месцы лагера партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага (за 3 км на паўночны захад ад вёскі).

### Вёска ВЯЛІКІЯ ЗІМОВІШЧЫ

**ПОМНІК М. В. ФРУНЗЕ.** У цэнтры вёскі, каля праўлення калгаса імя М. В. Фрунзе.

### Вёска КАЗІМІРАЎКА

**ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ** – мірным жыхарам вёскі, расстраляным і спаленым жывымі 22.3.1943 г. (у цэнтры вёскі).

### Вёска КАСЦЮКОВІЧЫ

**ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ** – мірным жыхарам вёскі, 30.6.1943 г. патопленым, спаленым, расстраляным, а таксама **ТРЫ ЖАЛЕЗАБЕТОННЫЯ ПЛІТЫ** на месцы калодзежаў, launches ператвораных карнікамі ў брацкія магілы (у цэнтры вёскі).

**МАГІЛА П. М. ДЗЯНЬГУБЕНКІ,** воіна Чырвонай Арміі, які загінуў у студзені 1944 г. пры вызваленні вёскі (за 1 км на поўдзень ад вёскі).

**ПОМНІК НА МАГІЛЕ** воіна-інтэрнацыяналіста С. У. Сіліча, які загінуў 8.9.1987 г. у Афганістане (вясковыя могілкі). На будынку школы ў в. Майсееўка ў памяць аб яе былым вучні ўстаноўлена **МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА.**

**Вёска РАМАНАЎКА**

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** трох партызан, якія загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне, у т. л. грамадзянін Славакіі Ш. Шверцал (заходняя ўскраіна вёскі).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** аб тым, што «В годы Великой Отечественной войны в 7, 11, 36, 37 кварталах Буда-Казимировского лесничества размещались партизанские отряды» (заходняя ўскраіна вёскі).

**Вёска СЛАБАДА**

**ПОМНІК У. І. ЛЕНІНУ.** У цэнтры вёскі, каля праўлення калгаса імя У. І. Леніна.

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** маракоў Прыпяцкай ваеннай флатыліі, чырвонаармейцаў, мірных жыхароў, якія загінулі ў 1918—1920 гг. у баях супраць кайзераўскіх і белапольскіх захопнікаў (вясковыя могілкі).

**ПОМНІК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні раёна і памерлі ў шпіталях ад ран (вясковыя могілкі).

**МЕМАРЫЯЛЬНЫ ПАРК і ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ,** якія загінулі ў 1941—1945 гг. на франтах, у партызанскіх атрадах і патрыятычным падполлі (у цэнтры вёскі).

**Вёска ШЧАКАТАВА**

**МЕМАРЫЯЛЬНЫ ЗНАК** аб разгроме нямецкага гарнізона партызанамі Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага і злучэння А. Сабурава 30.8.1943 г. (вясковыя могілкі).

**МЕМАРЫЯЛЬНЫ ЗНАК** на месцы бою партызан брыгады імя Аляксандра Неўскага з калонай войск праціўніка 3.10.1943 г. (дарога Слабада — Белая).

Падрыхтавалі

*М. Капач, І. Пілiпчук*

## Паміж мінулым і будучым

Дзевяць пасляваенных гадоў Мазыр заставаўся адміністрацыйным цэнтрам Палескай вобласці. 8 студзеня 1954 года Вярхоўны Савет БССР выдаў указ аб яе скасаванні, і Мазыр стаў раённым цэнтрам. Аднак горад працягваў інтэнсіўна расці і развівацца, ішло будаўніцтва новых прадпрыемстваў, пашыралася яго тэрыторыя. Значныя зрухі — эканамічныя, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя, дэмаграфічныя адбыліся за пасляваенны час і ў раёне. Некаторыя падагульняючыя звесткі такога характару — пра сённяшні Мазыр, пра сельскія населеныя пункты — прыводзяцца ніжэй.

Сённяшні дзень Мазыршчыны — гэта вынік таго гістарычнага шляху, які

Мазыр. Сходы ад гасцініцы «Прыпяць» да берага ракі

